# ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ



Недалёка ад в. Кушляны на Смаргоншчыне, на схіле Лысай гары ляжыць падоўжаная гранітная глыба вялікіх памераў, на якой лацінскімі літарамі быў зроблены надпіс "Памяці Мацея Бурачка. 1900 г.". Мацей Бурачок — псеўданім класіка беларускай літаратуры Францішка Багушэвіча. З яго гнеўна-выкрывальных вершаў, накіраваных супраць прыгнятальнікаў у абарону забітага нядоляй мужыка, пачынаецца крытычны рэалізм.

Паходзіў Багушэвіч з сям'і збяднелага шляхціца. Нарадзіўся ў фальварку Свіраны Віленскага павета. Дзяцінства паэта прайшло ў Кушлянах. Вучыўся спачатку дома, потым у Віленскай гімназіі. Менавіта ў гімназіі і сфарміраваўся светапогляд маладога Багушэвіча, яго вострая нянавісць да буржуазна-памешчыцкага ладу, да няроўнасці і эксплуатацыі. У 1861 г. Багушэвіч паступіў на фізіка-матэматычны факультэт Пецярбургскага універсітэта, з якога неўзабаве быў выключаны за ўдзел у масавых дэманстрацыях пратэсту супраць існуючага ладу. На радзіме ён удзельнічаў у грамадска-рэвалюцыйным руху, быў звязаны з рэвалюцыйным таварыствам "пятковічаў" на Ашмяншчыне, настаўнічаў у народнай школе в. Доцішкі Лідскага павета (цяпер Воранаўскі раён). У 1863 г. змагаўся ў адным з паўстанцкіх атрадаў К. Каліноўскага на Беласточчыне. Потым доўгі час хаваўся ў Вільні. Амаль уся яго сям'я была прыцягнута да суда за дапамогу паўстанцам. У маі 1865 г. Багушэвіч паступіў у Нежынскі юрыдычны ліцэй. Пасля яго заканчэння працаваў у якасці судовага следчага ў розных установах Чарнігаўскай і Валагодскай губерняў. Але службовая кар'ера не захапляла Багушэвіча. У 1884 г. ён звольніўся і пераехаў у Вільню, дзе заняўся адвакацкай практыкай. Паводле сведчання сучаснікаў, ён быў адным з лепшых прадстаўнікоў адвакатуры краю, але вялікіх капіталаў сваёй адвакацкай дзейнасцю не нажыў, бо, калі справы тычыліся беднякоў, вёў іх бясплатна. У гэты перыяд зблізіўся з прагрэсіўнай інтэлігенцыяй, актыўна супрацоўнічаў у дэмакратычным пецярбургскім часопісе "Кгај". У 1898 г. ён цяжка захварэў і таму перабраўся ў Кушляны, дзе праз некаторы час і памёр.

Пачатак літаратурнай дзейнасці Ф. Багушэвіча прыпадае на канец 70-х гг., але сталай літаратурнай працай ён пачаў займацца толькі пасля пераезду ў Вільню. У 1891 г. Багушэвіч пад псеўданімам Мацей Бурачок надрукаваў першую кніжку вершаў "Дудка беларуская". У 1892 г. у Кракаве выйшла яго рэалістычнае апавяданне "Тралялёначка", прысвечанае адлюстраванню характэрных грамадскіх працэсаў у беларускай вёсцы канца XIX ст. Другі зборнік "Смык беларускі" паэт

надрукаваў у 1894 г. пад псеўданімам Сымон Рэўка з-пад Барысава. У наступныя гады паэт падрыхтаваў яшчэ дзве кніжкі ("Скрыпка беларуская" і "Беларускія расказы Бурачка"), аднак лёс гэтых рукапісаў невядомы. Працаваў таксама над матэрыяламі да беларускага слоўніка. Ужо ў прадмове да "Дудкі беларускай", напісанай прозай, пясняр ясна і смела заявіў аб самабытнасці беларускага народа, які мае сваю гісторыю, культуру, тэрыторыю, выказаў патрэбу нацыянальнага самавызначэння беларусаў, сцвердзіў правы беларускай мовы, як мовы нацыянальнай. Лірычны герой яго вершаў — працоўны селянін, нястомны працаўнік, творца ўсіх матэрыяльных даброт і разам з тым духоўна скаваны, цёмны, даведзены да адчаю і жабрацтва. Такім ён прадстае ў добра вядомых вершах "Дурны мужык, як варона", "Як праўды шукаюць", "Бог не роўна дзеліць", "Хрэсьбіны Мацюка" і інш. Паэт стварае вобраз "будзіцеля" народнай свядомасці, праўдашукальніка, барацьбіта за народную справу. У праграмным вершы "Мая дудка" яго герой характарызуецца выключнай душэўнай актыўнасцю, адданасцю ідэалам вызвалення:

Сорак гадоў б'юся,
Ніяк не звярнуся,
Ніяк не натраплю
Вадзіцы хоць каплю,
Ды такой вадзіцы,
Ды з такой крыніцы,
Што, як хто нап’ецца,
Дык вольным стаецца.

Багушэвіцкі матыў узвышэння мужыка, абароны яго чалавечых правоў на свабоднае існаванне — вядучы ва ўсёй рэалістычнай беларускай паэзіі канца XIX ст. Вылучаецца ў творчасці паэта і тэма крытыкі царскага суда, жорсткасці і бюракратызму царскіх законаў. Арыентуючыся на ўзровень і культурныя запатрабаванні сялянскіх мас, Багушэвіч не мог не ўлічваць іх светаўспрыманне, густы і сацыяльную псіхалогію. Сувязь з народнымі традыцыямі выразна выступае ў вершах, баладах, песнях і байках паэта. Аднак, захоўваючы некаторыя адзнакі фальклорнай тыпізацыі, паэт напаўняў свае творы новым, актуальным патрыятычным зместам. Вялікі ўклад зрабіў Ф. Багушэвіч і ў развіццё беларускай публіцыстыкі XIX ст. Гэта, у першую чаргу, яго прадмовы да ўласных паэтычных зборнікаў — сапраўдныя нацыянальна-літаратурныя маніфесты, допісы ў "Kraj", таксама нелегальная брашура пра здзекі царскіх улад над веруючымі ў літоўскім мястэчку Крожы.

Сацыяльна-вострыя творы Ф. Багушэвіча праследаваліся ў царскай Расіі, таму яго кнігі выходзілі пад псеўданімамі за мяжой. Але менавіта яго творчасць дала жыватворны штуршок магутнаму ўзлёту беларускага нацыянальнага адраджэння XIX—пачатку XX ст., мела ўплыў і ўздзеянне на паслядоўнікаў, тых, хто прыйшоў на літаратурную ніву ў XX ст.

Літаратурная творчасць і грамадская дзейнасць Багушэвіча

абуджалі нацыянальную самасвядомасць беларусаў, яго ідэйная спадчына з'явілася фундаментам ідэалогіі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху пачатку XX ст. Пры жыцці творы Багушэвіча ў царскай Расіі былі забаронены. Яны выдадзены асобнымі кнігамі і лістоўкамі ў час рэвалюцыі 1905—1907 гг., аднак у 1908 г. на іх накладзены арышт. У Савецкай Беларусі ўпершыню выдадзены ў 1922 («Дудка беларуская»). Аднак у канцы 1920-х—30-я гг. ў БССР творчасць Багушэвіча была абвешчана буржуазна-кулацкай, нацыяналістычнай, да 1940 г. яго кнігі не друкаваліся. У Заходняй Беларусі імя паэта было сцягам барацьбы за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, выходзілі яго кнігі, навуковыя працы пра творчасць паэта. У Вялікую Айчынную вайну вершы Багушэвіча друкаваліся ў газеце «Савецкая Беларусь», іх патрыятычныя радкі клікалі змагацца за волю і незалежнасць Беларусі.

Захаваўся сямейны альбом Багушэвічаў (Нацыянальны музей Беларусі), лісты да Карловіча (ЦДГА Літвы, Аддзел рукапісаў Львоўскай дзяржаўнай навуковай бібліятэкі імя В. Стафаніка), Э. Ажэшкі (Інстытут літаратурных даследаванняў Польскай АН). Імя Багушэвіча прысвоена Ашмянскаму раённаму краязнаўчаму музею, калгасу ў Ашмянскім раёне; у Кушлянах адкрыты мемарыяльны музей Багушэвіча. Помнікі паэту ў Жупранах і на яго магіле. У Жупранскім касцёле — мемарыяльная дошка Багушэвіча.

## Т в о р ы Ф. Багушэвіча


1. Багушэвіч, Ф. Вершы / Ф. Багушэвіч. – Мінск, 1976.
2. Багушэвіч, Ф. Творы / Ф. Багушэвіч. – Мінск, 1967.
3. Багушэвіч, Ф. Творы / Ф. Багушэвіч. - Мінск, 1990.
4. Багушэвіч, Ф. Творы: вершы, паэма, апавяданні, артыкулы / Ф. Багушэвіч; уклад. з тэкстал. падрыхт., прадм. Я. Янушкевіча; камент. У.Содаля, Я. Янушкевіча. — Мінск: Мастацкая літаратура, 1998. — 206 с.; 1 л. партр.
5. Багушэвіч, Ф. Творы: паэзія, апавяданні, пераклады, публіцыстыка, лісты /Ф. Багушэвіч; уклад. з тэкстал. падрыхт., прадм. Я.Янушкевіча; камент. У.Содаля, Я.Янушкевіча; маст. Г.Хінка-Янушкевіч. — Мінск: Мастацкая літаратура, 1991. — 309 с, [8] л. іл., фат., I л. партр.
6. Dudkabialaruskaja. — Факс. выд. — Мінск: Мастацкая літаратура, 1990. —v, 73[1] с — Факс. узнаўленне выд.: Кгаkow: DrukswaimkosztamWZL, 1891.
7. Tralalonaczka. — [Рэпрынт. выд.]. — Мінск: Адраджэньне, 1992. — 11 с. — Аўт. паказаны на адвароце тыт. л. — Вых. дан. арыг.: Кгаkow, 1892. — Надрук. лацін. шрыфтам.

**Бібліяграфія:**


1. Александровіч,С., Александровіч, В. Беларуская літаратура XIX—1 пал. XX ст. / С.Александровіч, В.Александровіч. — Мінск 1978;
2. Александровіч, С.Х. Багушэвіч Францыск / С.Х. Александровіч // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. У 5 т. Т.1. – Мінск, 1984. — С. 259—260.
3. Александровіч, С. Гісторыя і сучаснасць / С. Александровіч. — Мінск, 1968. – С. 139—164.
4. Александровіч, С. Незабыўнымі сцежкамі / С. Александровіч. — Мінск, 1962. – С. 44—70.
5. Александровіч, С. Па слядах паэтычнай легенды / С.Александровіч. – Мінск, 1965. – С. 135—146.
6. Александровіч, С. Старонкі братняй дружбы / С.Александровіч. - Мн., 1960.
7. Багушэвіч Францішак // Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры. Т. 2. – Мінск, 1969.
8. Багушэвіч Францішак Бенядзікт Казіміравіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Мінск, 1993. — Т. 1. — С. 275—276.
9. Багушэвіч Францішак // Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік. — Мінск, 1992. — Т. 1. — С. 182—191.
10. Багушэвіч Францішак Бенядзікт Казіміравіч // Бел. энцыклапедыя. — Мінск, 1996. — Т. 2. — С. 210—211.
11. Барысенка, В.В. Багушэвічы // Беларуская савецкая энцыклапедыя. Т. 2. – Мінск, 1970. – С. 65—66.
12. Барысенка, В.В. Францішак Багушэвіч і праблемы рэалізму ў беларускай літаратуры XIX ст. – Мінск, 1957.
13. Булгакаў, В.У. Творчасць Ф. Багушэвіча ў ацэнках беларускай і замежнай крытыкі XIX—XX стст. / В.У. Булгакаў // Веснік БДУ. Серыя 4, Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. — 1998. — № 2. — С. 18—22.
14. Булгакаў, В. Францішак Багушэвіч: чытаем спачатку / В. Булгакаў // ЛіМ. — 1998. — 31 ліпеня. — № 31. — С. 6—7.
15. Быхавец, У. Лынтупы: пра паселішча Пастаўскага раёна, з якім звязана імя Ф.Багушэвіча / У. Быхавец // Роднае слова. — 1994. — № 11. — С. 74—77.
16. Васючэнка, П. Трансцэндэнтальнае падарожжа Мацея Бурачка: пра "Дудку беларускую" / П. Васючэнка // Першацвет. — 1999. — № 7/8. — С. 43—45.
17. Гаранін, Л.Я. Нацыянальная ідэя ў беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя / Л.Я.Гаранін; навук. рэд. М.І.Мушынскі. — Мінск: Беларуская навука, 1996. — 176 с.
18. Гарэцкі, М. Гісторыя беларускай літаратуры / М.Гарэцки. — 3 выд. — Масква; Ленинград, 1924;
19. Да 180-годдзя з дня нараджэння Францішка Багушэвіча // Наша слова. — 2020. — С. 2.

20. Дорошевич,Э., Конон, В. Очерк истории эстетической мысли Белоруссии / Э.Дорошкевич, В.Конон. — Москва, 1971.
21. Запісы Беларускага навуковага таварыства. — Сш. 1. — Вільня, 1938.
22. "Каб яго пачулі, каб яго пазналі ...": новыя матэрыялы да біяграфіі Ф.Багушэвіча / уступ. арт. і публ. Г.Запартыкі // Полымя. — 1998. — № 10. — С. 183—196.
23. Карский, Е. Белорусы / Е.Карский. – Москва, 1922. — Т. 3, вып. 3. — С. 194—212.
24. Кісялёў, Г. 3 думай пра Беларусь / Г. Кісялеў. — Мінск, 1966. — С. 233—317.
25. Кісялёў, Г.В. Радаводнае дрэва: Каліноўскі — эпоха — наступнікі / Г.В.Кісялеў. — Мінск: Мастацкая літаратура, 1994. — С. 62, 292.
26. Кісялёў, Г. Сейбіт вечнага / Г. Кісялеў. — Мінск 1963. – С. 255—302.
27. Кісялеў, Г. Францішак Багушэвіч і паўстанне 1863 года / Г.Кісялеў // Роднае слова. – 2001. — №3. – С. 89—92.
28. Кісялеў, Г. “Як соладка памерці за радзіму!..” Паўстанцкі камандзір Францішак Багушэвіч // Кісялеў, Г. Радаводнае дрэва: Каліноўскі – эпоха – наступнікі. – Мінск, 1994.
29. Лецка, К. Нявывучаныя старонкі літаратурнай спадчыны Францішка Багушэвіча / К.Лецка // Гарадзенскія запісы: старонкі гісторыі і культуры. — Гародня, 1996. — Выпуск 2. — С. 74—80.
30. Лойка, А. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд. Ч. 1. 2 выд./ А. Лойка. — Мінск, 1968.
31. Лукша, Г. А памяць жыве: пра гісторыю в. Жупраны і Жупранскі музей Ф. Багушэвіча / Г.Лукша // Роднае слова. — 1995. — № 3. — С. 70—71.
32. Майхрович,А. С. Белорусские реакционные демократы / А.С.Майхрович. — Минск, 1977.
33. Майхрович, С.К. Жизнь и творчество Ф. Багушевича / С.К. Майхрович. – Минск, 1961. – С. 54—55.
34. Мальдзіс, А. Багушэвічазнаўства: здабыткі і перспектывы / А.Мальдзіс // Весці АН Беларусі. Серыя грамадскіх навук. – 1992. — №3 — 4. – С. 95.
35. Навуменка,І. Пісьменнікі-дэмакраты / І. Навуменка. — Мінск, 1967. – С. 71—108.
36. Орлов, В., Саганович, Г. Десять веков белорусской истории / В.Орлов, Г.Саганович. – Вильня: Наша будучыня. – 2001. – С. 204—205.
37. Пачынальнікі / складальнік: Г. Кісялёў. — Мінск, 1977.
38. Пяткевіч, А.М. Літаратурная Гродзеншчына: Мясціны. Людзі. Кнігі / А.М.Пяткевіч. — Мінск: Бацькаўшчына, 1996. — С.13—14.
39. Руль, Ул. Абаронца праўды / Ул. Руль // Воранаўская газета. – 2005. – 6 красавіка. – С. 3.
40. Руль, Ул. Прысвячэнне Францішку Багушэвічу / Ул. Руль //

Воранаўская газета. – 2005. – 6 красавіка. – С. 3.
41. Светозаров, Л. Богушевич и Дотишки / Л. Светозаров // Воранаўская газета. – 2000. – 19 красавіка. – С. 4.
42. Светозаров, Л. Богушевич в отряде Нарбута / Л.Светозаров // Воранаўская газета. – 1992. – 3 чэрвеня. – С. 3.
43. Содаль, У.І. Жупранская старонка / У.І. Содаль. — Мінск: Полымя, 1992. — 63 с.: іл.
44. Содаль, У. Імпульсы / У. Содаль // Полымя. – 1989. — № 6. – С. 194—210.
45. Содаль, У.І. Кушлянскі кут / У.І. Содаль. — Мінск: Полымя, 1990. — 61,[2] с., 1 л. партр.
46. Содаль, У.І. Свіранскія крэскі / У.І. Содаль. — Мінск: Полымя, 1995. — 96 с.: фат.
47. Содаль, У.І. Сцежкамі Мацея Бурачка: пошукі, замалёўкі, нарысы / У.І. Содаль. — Мінск: Мастацкая літаратура, 1991. — 197 с., [24] л. іл., фат.
48. Стральцоў, М. Жыццё ў слове / М. Стральцоў. – Мінск, 1965. – С. 5—13.
49. Францішак Багушэвіч у Доцішках, на Віленшчыне // Майхровіч, С. Нарысы беларускай літаратуры XX стагоддзя / С. Майхровіч. – Мінск, 1959. – С. 135.
50. Францішак Багушэвіч: жыццё і творчасць / склад. У.І. Содаль, Е.У. Мацюш; маст. М.Купава . – Мінск, 1986. – С. 30, 101.
51. Францішак Багушэвіч: матэрыялы аб жыцці і творчасці / К.Сваяк, А.Станкевіч, А.Каўка // Крыніца. — 1995. — № 11/12. — С. 2—31.
52. Францішак Бенядзікт Багушэвіч: жыццё і творчасць ІФотаальбом] /склад. У. Содаль, Е. Мацюш. – Мінск, 1986.
53. Францішак Багушэвіч (1840—1900) // Гісторыя беларускай літаратуры: XIX—пач. XX ст. — 2-е выд., дапрац. — Мінск, 1998. — С. 118—144.
54. Цвірка, К. Тут грала дудка Бурачка: па мясцінах жыцця / К. Цвірка // Цвірка, К. Лісце забытых алеяў: эсэ / К.Цвірка. — Мінск, 1993. — С. 335—407.
55. Ягорычаў, У.Я. Францішак Багушэвіч — беларускі паэт, празаік, публіцыст / У.Я. Ягорычаў // Ашмяншчына: гісторыя і сучаснасць. Гродна; Ашмяны, 1995. — С. 21—24.
56. Янушкевіч, Язэп. Францішак Бенедзікт Багушэвіч / Язэп Янушкевіч // Славутыя імены бацькаўшчыны. Вып.1.: зборнік / уклад. У. Гілеп і інш. — Мінск, БФК, 2000. – 384 с.
57. Янушкевич, Я. "На всю Беларусь миллион прокуроров ..." / Я. Янушкевич // Из тьмы веков светлеющие лики. — Минск, 1994. — С. 163—173.